# КАЗАЧНАЕ СВЯТА ПРЫГАЖОСЦІ

**На працягу месяца прыгажуні сталіцы рыхтаваліся да фіналу конкурсу прыгажосці «Міс Мінск — 2025». За плячыма — шмат рэпетыцый, фотасесій і разнастайных мерапрыемстваў. Усё для таго, каб па-сапраўднаму ўразіць гледачоў і журы на галоўным шоу, якое прайшло ў Палацы Рэспублікі.**

Па словах **намесніка старшыні Мінгарвыканкама Андрэя СТРЫГЕЛЬСКАГА**, конкурс «Міс Мінск» — брэнд сталіцы.

— Ён праводзіцца далёка не першы раз, і гэта вельмі яркае шоу, знамянальная падзея для горада. Ужо на этапах адбору мы бачым, як расце цікавасць да конкурсу. Мінгарвыканкам, вядома, удзяляе вялікую ўвагу падрыхтоўцы гэтай падзеі, — адзначыў ён.

Андрэй Стрыгельскі дадаў, што фінальнае шоу — гэта кампіляцыя рэжысёрскай канцэпцыі і талентаў, а таксама здольнасцяў саміх дзяўчат.

Фінал атрымаўся вельмі яркім, канцэптуальным і сімвалічным. Напрыклад, першы выхад быў адметны тым, што спецыяльна для яго фіналісткі развучылі мову жэстаў, што зрабіла асноўны пасыл зразумелым для ўсіх. Усяго прайшло пяць дэфіле, якія раскрывалі дзяўчат з розных бакоў, падкрэсліваючы шматлікія грані іх прыгажосці. Дапаўняла дзею жывая музыка ў выкананні беларускіх артыстаў. Так, дэфіле ў народных касцюмах суправаджалася выступленнем спявачкі Nevika, што зрабіла яго непаўторным і запальным.



Доўгачаканым стаў фінальны выхад у вячэрніх сукенках. Яшчэ да пачатку шоу дзяўчаты прызнаваліся, што адчуваюць сябе ў іх казачнымі прынцэсамі. Уборы сапраўды выглядалі чароўнымі. Гэты выхад быў асабліва важны яшчэ і таму, што падчас яго нарэшце раскрылася галоўная інтрыга вечара.

По выніках усіх конкурсных выпрабаванняў шчаслівай уладальніцай тытула «Міс Мінск» стала 18-гадовая Кацярына Трыкоза. Дзяўчына вучыцца ў БДУКМ на рэжысёра. Вольны час праводзіць з карысцю: займаецца плаваннем, гімнастыкай, адзінаборствамі і танцамі, а яшчэ развіваецца ў сферы акцёрскага мастацтва. Плануе схадзіць на кастынг «Міс Беларусь», а таксама працягне актыўна ўдзельнічаць у развіцці Мінска і жыцці моладзі. Цікава, што ў дадатак да галоўнага тытула Кацярына ўзяла яшчэ і «Прыз сімпатый гледачоў».

А вось першай віцэ-міс стала 19-гадовая студэнтка МІПСА Віталія Жмако, а другой — 20-гадовая студэнтка БДПУ Алія Кароткая.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**











